Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!



# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 33 (131) Серада, 7 сакавіка 1990 года

# Віншуем са святам!

## ТЭЛЕГРАМА Ў НУМАР

**Рэктарат, партыйны камітэт, прафкомы, камітэт камсамола, уся мужчынская палова калектыву Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы сардэчна віншуюць выкладчыц, студэнтак факультэтаў з Міжнародным жаночым днём 8 Сакавіка. Жадаем творчых поспехаў у працы, вучобе, здароўя, шчасця, бадзёрасці, непаўторнасці, сардэчнасці.**

**Няхай заўжды будзе ў вас, мілыя жанчыны, добры настрой, цёплая ўсмешка тым, хто з вамі побач. Няхай будзе светлым і радасным гэта цудоўнае веснавое свята!**

***

Зноў вясна — пара амаладжэння,
Пара вяртання птушак і надзей,
Штогодняя эпоха Адраджэння
Лясоў і рэчак, сонца і людзей.
На гэты баль прыроды ўсіх
гасцінна
Чароўна запрашае сакавік.
Са святам, нашы любыя
жанчыны!
Хай светлых дзён бясконцым
будзе лік!

***



## ЗАГАДКА АДЗІНАЯ І ДАСКАНАЛАЯ

Дачушка-першаклашка, якой толькі-толькі раскрываецца таемная повязь літар у словах, з насалодай чытае ўсё, што ні трапіцца на вока, аднойчы спытала: чаму 23 лютага ў календары напісана чорнымі літарамі, а 8 Сакавіка — чырвонымі?

Мілая, наіўная немаўлятка. Яна яшчэ не ведае, што задала пытанне, над якім не магла распрасцерці свае крылы ні вечнасць часу, ні самы дапытлівы розум філосафа. Бо...

Бо Жанчына — вечная загадка. Загадка матэрыі. Хто, які філосаф, адкажа, што першаснае тут: дух ці матэрыя, матэрыя ці дух? Што сваімі мужчынскімі няўклюднымі адчуваннямі ўспрымаеш найперш? Ці «мимолетное виденье», якое натхніла паэтычны геній, ці «сковороду бесовскую»; «цвет диавола», нешта «очами мигающа», «ногами играюща», што наганяла грахоўны панічны страх на схімнікаў, манахаў?

Чаму самыя ласкавыя і самыя цёплыя словы — жаночага роду, і ў адначассе жаночымі найменнямі пазначаны самыя лютыя і самыя страшныя цыклоны?

Чаму нават пан Бог перадаверыў права ўкусіць райскі яблык Адаму, а сам, відаць, спалохаўшыся таго хараства і цнатлівасці, што стварыў, падкінуў у боскае варыва кропельку змяінага яду?

Чаму ж і мужчыны, здолеўшы толькі паэтычна канстатаваць, што з жанчыны «пачаўся свет, ласкавы і пакорны», не адважыліся ісці далей канстатацыі гэтага факта?

Чаму?.. Чаму?.. Чаму?..

Здаецца, у нашым неабсяжным свеце Жанчына — адзіная і дасканалая загадка, якая ўжо ў самім зародку сваім патрабуе менавіта неразгадкі, неразгаданасці яе. Будзе страшным той міг і будзе нешчаслівым той чалавек, калі раптам таямніцу гэту ўдасца расшыфраваць. Спыніцца гадзіннік.

Дык будзьце ж такімі, мілыя жанчыны, беражыце святасць гэтай загадкі, і хай далёкае таемнае свячэнне нераспазнанасці шчаслівым ахоўным знакам атуляе ваш лёс, і хай кожны наступны дзень робіць вас яшчэ больш раскошнымі, чым дзень папярэдні. Шчыра зычу вам гэтага.

Толькі... хіба што больш пастаянства і менш капрызу, чым сёлетняе надвор'е.

**І. ЖУК,**
**дацэнт кафедры беларускай літаратуры.**

## МІРУ ТАБЕ, ЖАНЧЫНА

Жыццё не стаіць на месцы. Кожны новы год, нават дзень, прыносяць нам шмат самых розных падзей. Асабліва гэта адчуваецца зараз, калі ў краіне — абнаўленне, і мы па-новаму пазіраем на ўсё, што вакол нас адбываецца, у большасці сваёй імкнемся ўдзельнічаць у перабудове, уплываць на яе, адстойваць свой пункт гледжання.

Зразумела, і ў сабе мы адчуваем змены. Нeяк мне задалі пытанне: маўляў, за плячыма не адзін дзесятак пражытых гадоў, многа на жыццёвым шляху сустрэў самых розных людзей, але вось як думаеш, жанчына ў гэтым ассяроддзі мяняецца?

Так, яна сёння зусім не тая, якой была ў пару майго юнацтва. Больш раскованая, я б сказаў, смелая, рашучая, актыўная, з нязменным жаданнем перамагаць цяжкасці. Але, на жаль, гэтых цяжкасцей, турбот, праблем так многа, што іншы раз проста дзіву даешся: як яна, працаўніца, маці, жонка можа ўсё паспець? Наша грамадства патрабуе ад жанчын бясконца многа, але вось ці гатова зрабіць яе жыццё насычаным, прыгожым, шчаслівым? Тут надзеі пакуль што на будучыню.

Але ж заўтра — свята нашых мілых жанчын. І так хочацца, каб у гэты дзень кожная з іх была сагрэта цяплом, каханнем дарагіх і блізкіх ёй людзей. Здароўя вам, аптымізму, дабрабыту, веснавога настрою!

**Я. МАРАШ.**

## А Б ' Я В А

**7 сакавіка, 19.30.**

**Факультэт грамадскіх прафесій, прафком студэнтаў даюць вам магчымасць павіншаваць са святам 8 Сакавіка Цудоўную Палову Чалавецтва!**

**Ад вашага імя віншаваць са сцэны актавай залы галоўнага корпуса універсітэта будуць СТЭМ, ВІА, студыя бальнага танцу і іншыя самадзейныя артысты.**

**Уваход на канцэрт па запрашальных білетах ФГП.**

### АБ ТЫХ, ХТО ПОБАЧ

# АГЕНЬЧЫК РАДАСЦІ



Знаёмцеся: Ала Сліскевіч. Лічу, што студэнты філалагічнага факультэта добра яе ведаюць. Ала — нязменны камандзір будаўнічага атрада імя В. Соламавай, член Вучонага Савета універсітэта, некалькі гадоў была членам камітэта камсамола, «правай» рукой сакратара, у неабходную хвіліну магла замяніць яго ў рабоце.

Прыемныя рысы твару, мілая ўсмешка, у вачах — іскрынкі. Сябры і знаёмыя гавораць аб ёй у першую чаргу як аб цудоўным таварышы, які ў цяжкі момант умее выслухаць, зразумець, дапамагчы, знайсці патрэбнае слова падтрымкі. А колькі ў гэтым добрым сэрцы гумару, цудоўнага настрою, запалу. І наогул, яна вельмі цікавая дзяўчына: на любую тэму падтрымае размову.

Не выпадкова менавіта Ала Сліскевіч была ад імя філалагічнага факультэта вылучана ў састаў Вучонага савета. Вырашылі студэнты, што іх праблемы такі чалавек заўжды зможа вынесці на абмеркаванне, абараніць іх інтарэсы і погляды.

**— Ала, ці цяжка сумяшчаць вучобу і грамадскую работу ў камсамольскай арганізацыі, у Савеце універсітэта!**

— Вядома, нялёгка. На 5 курсе — асабліва, бо стала цяжэй вучыцца, пастаянна адчуваеш адказнасць за свае веды, за тое, з якім багажом прыйдзеш у школу. Цяперашняя практыка ў школе яшчэ раз паказала, як кепска мы падрыхтаваны да сваёй работы з дзецьмі. Методыка выкладання — амаль што нуль, ды і веданне школьнай праграмы недалёка ад гэтай лічбы. Таму на апошнім курсе я раблю ўсё магчымае для таго, каб папоўніць запас ведаў філолага. Нейк нават і грамадская дзейнасць адышла на дальні план.

А, наогул, мне здаецца, было б зусім нецікава жыць, тым больш на філфаку, каб існавала толькі адна вучоба, без уласнай ініцыятывы, задору ў камсамольскай рабоце. Вось таму і не было гэта нейкай абузай, а прыносіла задавальненне, поспехі — радасць, а няўдачы — жаданне абавязкова зразумець памылкі і прыйсці, нарэшце, да добрых вынікаў.

Трэба адзначыць, што ініцыятывы Але не займаць: яна неаднойчы выступала і на камсамольскіх сходах, і на паседжаннях камітэта камсамола, не раз дзелавыя прапановы гучалі на Вучоным савеце універсітэта. Напрыклад, прымала ўдзел у абмеркаванні такіх важных для студэнтаў пытанняў, як становішча ў студэнцкім інтэрнаце, самастойная работа студэнтаў і наведванне лекцый, мэтазгоднасць чытання курсаў па спецыяльных дысцыплінах.

**— Калі ласка, некалькі слоў аб тваім удзеле ў трэціх працоўных семестрах. Хацелася б пачуць і пажаданні будучым камандзірам і камісарам.**

— Ведаеце, мне здаецца, што быць студэнтам, і пры гэтым абысціся без будатрада, проста немагчыма. Таму, калі паступіла ва універсітэт, для мяне не стаяла пытанне, ці ўдзельнічаць у летнім працоўным семестры. Рашэнне было адназначным. Тое, што я не раз кіравала будатрадам імя В. Соламавай (дыслацыраваўся ён у Ваўкавыскім раёне ў саўгасе «Волпа»), радавала, але адказнасці было вельмі многа. Кожны раз хвалявалася: ці атрымаецца?

І кожны раз атрымлівалася. Пачынала Ала ў 1986 годзе байцом сельгасатрада ў саўгасе «Волпа». У 1987, 1988 гадах была камандзірам гэтага атрада. Дарэчы, атрад А. Сліскевіч у сваёй зоне заўсёды быў у першых радах пераможцаў. І з дзяўчынай-камандзірам, якая добра ведае сваю справу, можа наладзіць кантакт са сваімі байцамі, з кіраўніцтвам, жадалі штогод працаваць многія. Мне на вочы папаліся спісы байцоў атрада Сліскевіч. І сапраўды: многія прозвішчы (гэта, у асноўным, дзяўчаты з філалагічнага факультэта) паўтараліся з году ў год.

— Пажадаць сваім пераемнікам хочацца вельмі многа. Але скажу галоўнае. Памятайце, што будаўнічы атрад — лепшая праверка характару чалавека, яго ўмення жыць у калектыве. Працаваць з людзьмі — надзвычай цяжкая справа. Таму, будучы кіраўніком, не абыйсціся без умення зразумець чалавека, дапамагчы, пры неабходнасці. І яшчэ: атрад тады зможа добра працаваць, весела і з карысцю адпачываць, калі, дзякуючы камандзіру і камісару, будуць паміж байцамі адносіны добрасумленнасці, узаемадапамогі, шчырасці...

Мінулым летам Але пашанцавала: у складзе групы лепшых студэнтаў адпачывала ў Балгарыі. Засталося шмат уражанняў ад жыцця замежных студэнтаў, ад цёплага мора і новых знаёмстваў.

...У групе Ала была своеасаблівым агеньчыкам радасці. Патрэбны ўсмешка, жарт, гумар — калі ласка, гэтага ў Алы вялікі запас.

Добры настрой дазваляе ёй ніколі не падаць духам, быць у самым цэнтры падзей, рабіць сваё жыццё і жыццё акружаючых яе людзей больш цікавым і вясёлым. У вольную хвіліну Ала чытае кнігі, аддаючы перавагу тым, дзе больш гумару, наведвае сяброў.

**— Ала, у хуткім часе скончыцца тваё студэнцкае жыццё. Што застанецца ў памяці добрага, запаветнага!**

— Цяпло студэнцкага сяброўства ў час працы ў сельгасатрадзе, цяпло студэнцкага кастру і смак печанай бульбы. Буду памятаць усё жыццё хвіліны радасці пасля паспяховай здачы экзамена, пасля шумных і цудоўных універсітэцкіх капуснікаў. Вядома, назаўсёды ў сэрцы застануцца і мае шматлікія сябры...

**Н. БЕДЗЬ.**

# «Краскі нашага жыцця»

Які цяжар носіць у сабе жаночая душа, але выпраменьвае яна столькі святла і радасці, што робіць людзей дабрэйшымі, мякчэйшымі. Шмат у нас розных свят, але чыста жаночае адно — 8 Сакавіка. Дык трэба зрабіць так, каб яно было сапраўдным святам. Трэба адгарадзіць жанчыну ад усіх дамашніх клапот і турбот, зняць з яе плячэй цяжар жыццёвай прозы. Можна гаварыць і пералічваць шмат «трэба», але чаго жанчына чакае больш у гэты дзень: падарункаў, кветак? Не! Яна чакае ціхага, добрага, ласкавага і шчырага слова ад мужчыны, ад сваёй «палавіны».

Нядаўна я размаўляла са студэнтамі юрыдычнага факультэта III курса I групы. Яны расказвалі пра дзяўчат сваёй групы. Іх тут нямнога, усяго толькі 7, а хлопцаў — 18. Дзяўчаты, як ружы, цвітуць сярод іх, упрыгожваюць іх студэнцкае жыццё. І калі я запыталася, ці не хацелі б яны вучыцца ў групе, дзе няма дзяўчат, усе хорам адказалі, што не. Без дзяўчат жыццё іх стане шэрым.

Уладзімір Кліменцеў назваў жанчын «кветкамі нашага жыцця». Нідзе не разлучаюцца студэнты-трэцякурснікі са сваімі дзяўчатамі. Разам едуць на бульбу і ў будаўнічыя атрады, разам праводзяць цікавыя вечары. Кожны год на святы 23 лютага, 8 Сакавіка арганізоўваюць салодкі стол, дзе заўсёды весела. У гэтай групе ёсць студэнты Станіслаў Занеўскі і Жана Аляшкевіч, якія стварылі сям'ю. Увогуле, група дружная. І цікава тое, што ўсе кіраўнічыя пасады ў групе, калі можна так сказаць, займае мужчынскі пол.

Юрый Сянько, Ігар Палыка, Уладзімір Кліменцеў лічаць, што дзяўчаты выбралі вельмі складаную прафесію. Лічаць яе мужчынскай, хаця некаторыя спецыяльнасці можна аднесці і да жаночых. Наогул, справа юрыста, следчага і іншыя патрабуюць мужчынскай сілы, устойлівасці, вынослівасці. Але цяперашнія дзяўчаты ва ўсім хочуць і стараюцца быць падобнымі да мужчын, страчваючы падчас сваю жаноцкасць...

Уладзімір Сазонаў лічыць, што ідэальнай дзяўчыны няма. Але вельмі непрыгожа, калі яна курыць, наогул, дрэнна сябе паводзіць... Хацелася б бачыць дзяўчат прыгожымі, акуратнымі, чыстымі душой, зацікаўленымі сваёй справай.

— Яшчэ са школьных гадоў па традыцыі дарылі дзяўчатам на свята нешта цікавае. У студэнтаў гэта таксама мае месца. Хаця студэнцкая стыпендыя невялікая, мы мяркуем зрабіць прыемнае для нашых дзяўчат, а што — гэта пакуль што сакрэт!

**Г. КАМЯНЕВА.**

### СТУДЭНЦКАЯ СЯМ'Я

# ЯК СТАЦЬ ШЧАСЛІВАЙ?..

**Вы — пачатак прыгажосці, вы — жыцця першапрычына, бачу будучыню вашу я ў служэнні хараству, я цалую вашы рукі, беларускія жанчыны, я схіляю перад вамі ў знак пашаны галаву.**

**Алесь ЗВОНАК.**

Якая шчырая любоў, сардэчнасць і гонар за нашых цудоўных жанчын гучаць у словах А. Звонака. Асабліва ў гэты перадсвяточны дзень, калі ўсе ўсмешкі, кветкі належаць толькі ім — жанчынам. З гэтымі словамі проста нельга не пагадзіцца. Гэта ад яе, жанчыны, залежыць цеплыня сямейнага ачагу, радасць мужа, усмешка першага немаўляці...

З вялікай нецярплівасцю чакаюць жанчыны свята 8-га Сакавіка. Свайго любімага свята, бо менавіта ў гэты веснавы дзень мужчыны імкнуцца быць як мага больш уважлівымі, адгарадзіць сваю каханую ад усіх турбот. А як прыемна прайсціся каля магазіна «Кветкі» і ўбачыць у чарзе амаль адных мужчын, чаго не заўважыш у будзённыя дні!



У гэты святочны дзень — 8 Сакавіка — Валянціну Манюк віншуюць муж і сын — абодва Сярожы.

А жадаюць яны ёй, каб заўсёды была такой маладой і прыгожай, ветлівай і пяшчотнай, каханай, дарагой.

Валянціна і Сяргей — студэнты-пяцікурснікі філалагічнага факультэта. А сынку ўжо больш года.

— Ведаеце, ён у нас ужо дарослы, — кажуць бацькі. І дадаюць, — ну, вось запытайцеся ў яго, хто ў нас гаспадар у хаце?

А Сярожка, гэты няўрымслівы, жвавы, вельмі прыгожы хлапчук, ужо спяшаецца ўключыцца ў размову. І гаворыць з радасцю і асаблівым дзіцячым гонарам: «Я!».

Так, нялёгкая гэта справа — быць адначасова студэнтамі і бацькамі. Але маленькі Сержык, як сонечны праменьчык, асвятляе іх жыццёвы шлях. Гэта дзякуючы яму сям'я стала больш дружнай. Што там казаць, не раз студэнты-аднакурснікі па-добраму зайздросцілі іх шчасцю.

Вучацца Сяргей і Валянціна ў адной групе, на адным курсе, у адну змену. Калі сын быў зусім маленькі, бывалі выпадкі, калі занятні наведвалі па чарзе. Сесіі заўжды імкнуліся здаваць добра: хацелася ад сяброў не адстаць, ды і стыпендыя ў сямейным бюджэце была вельмі значным падспор'ем.

— Па хатняй гаспадарцы Сяргей вельмі мне дапамагае, — расказвае Валянціна. — Наогул, работу ніколі не дзелім на мужчынскую і жаночую. Усе выконваем разам, дружна.

Што гаварыць, не абыходзіцца ў іх сям'і без цяжкасцей. Ды і за плячыма ў маладых людзей іх таксама нямала. Сярожка, калі нарадзіўся, быў вялікім свавольнікам. Спаць даводзілася па некалькі гадзін у суткі.

— Што вы, я адна тады б з ім не справілася, — і маладая маці расказвае, як дзяжурылі ў калыскі па чарзе, на змену...

Так, можна было папрасіць дапамогі ў бацькоў. Але яны цвёрда вырашылі тады, што сваё «сонейка» нікому, нават блізкім, не аддадуць, будуць выхоўваць самі. А зараз ужо крыху лягчэй: сынок пачаў самастойна хадзіць.

Сяргей-старэйшы вельмі кахае і паважае сваю жонку, гаспадыньку. Ён удзячны лёсу, што сустрэліся аднойчы і назаўсёды сталі такімі блізкімі, роднымі, патрэбнымі адзін аднаму. Так, ён знайшоў сваю Папараць-кветку.

А што Валянціна? Яна, нягледзячы на бясконцыя турботы і клопаты, такая ж, як і ў дзявочыя гады: стройная, прывабная, акуратная. Калі я пытаю ў Валі, якімі якасцямі павінна валодаць сучасная жанчына, каб пабудаваць добрую сям'ю, а потым захаваць яе на доўгія гады, прыводзіць словы французскага паэта Антуана Эроэ. Напісаны яны больш як 300 гадоў назад, але ў іх — сутнасць барацьбы жанчыны за свайго мужа, а, значыць, і сям'ю:

Он ищет красоты — прекрасной стану,
Ума — божественной пред ним предстану..
И если трудно верным быть одной —
Он тысячу найдет во мне самой
Коль хочет, пусть меняет их беспечно —
Все ж от меня не отойдет он вечно

**І. БАГАТЫРКА.**



## КЛУБ ПЕДАГАГІЧНЫХ СУСТРЭЧ

# Педагог, паэтэса

**На гэты раз у гасцях студэнтаў і выкладчыкаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта была Алена Вітальеўна РУЦКАЯ, настаўніца СШ № 2 г. Слоніма.**

**Член Саюза пісьменнікаў БССР і заслужаная настаўніца БССР. Паэтэса і педагог. Рэдкае гэта спалучэнне. Яно вымагае не толькі таленту і ведаў, але і асаблівага дару душы — умення слухаць і чуць душы іншых, каб вяртаць набытае пераўтвораным паводле высокіх законаў мудрасці, чалавечнасці і хараства.**

**Такім дарам валодае Алена Вітальеўна Руцкая. Той, хто быў на яе сустрэчы са студэнтамі і выкладчыкамі, напэўна, заўважыў найперш рэдкую вытрыманасць — у выяўленні пачуццяў, у жэстах, інтанацыі голасу — нават паважнасць гэтай маладой жанчыны. Адкуль гэтая ранняя паважнасць! Ад рацыянальнага самакантролю настаўніцы, прызвычаенай да ўвагі людзей! Мусіць, так. Але, у першую чаргу — ад сапраўднай сталасці творчай асобы, якая мае свае духоўныя сакрэты жыцця. Ды і ад годнасці чалавека, які ведае цану сабе і той справе, якой служыць.**

**Яна выступае на навуковых педагагічных канферэнцыях, на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў, у педагагічным друку рэспублікі. Яе вершы перакладзены на польскую, рускую, украінскую, армянскую, таджыкскую мовы.**

**Сцяжына ў яе жыцці пабегла з вёскі Дзякаўцы Шчучынскага раёна. Студэнцкія гады прайшлі на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.**

**Друкуецца з 1965 года. Настаўнічае з 1971-га. Апошнім часам — у сярэдняй школе № 2 горада Слоніма.**

**А. ПЯТКЕВІЧ,**
**дацэнт кафедры беларускай літаратуры.**

# Выхаванне праўдай

Сённяшні час — гэта час пытанняў, складаных пытанняў, якія пастаўлены перад нашай свядомасцю, перад нашым сумленнем. Мы павінны знайсці адказы на іх, гэта наш абавязак перад продкамі і нашчадкамі.

Стагоддзямі як выверaную ісціну перадавалі прашчуры сваім спадкаемцам словы: «Калі на языку — мёд, на словах — малако, у сэрцы — жоўць, а ў справах хлусня, руйнуецца наш жыццёвы дом». Чаму ж не ўсвядомілі мы гэтай навукі? Чаму ж, пачаўшы шлях ад самых светлых і гуманістычных памкненняў, мы не адчуваем сёння спакою за свой жыццёвы дом? І нельга не пагадзіцца са сцверджаннямі, што сённяшняя барацьба за перабудову, дэмакратызацыя — наш апошні шанц у аднаўленні грамадства.

Сумленнасць, дабрыню, міласэрнасць нельга абвясціць нават з самай аўтарытэтнай трыбуны. Яны павінны ўзрасці ў чалавечым сэрцы. Задачу выхаваць змену разумнай, высакароднай, працалюбівай мы ставілі заўсёды. Толькі як вырашалася гэта задача? У асноўным, дэкларацыйна, на словах, што, як кажуць у народзе, робіць душу відушчай толькі на адно вока. У пагоні за ўсеагульным мы забыліся на непасрэднае, што з'яўляецца вызначальным, асноўным, што складае непаўторны воблік чалавека як часцінкі пэўнага народа. Мы адарваліся (не без дапамогі парушэння ленінскай нацыянальнай палітыкі) ад духоўнай спадчыны, ад народных традыцый і звычаяў, ад літаратурнай і мастацкай класікі. Міжволі прыгадваюцца словы французскага пісьменніка Экзюперы, калі Маленькі Прынц спытаўся ў кветкі: «Дзе ж людзі?» і пачуў у адказ: «Іх носіць ветрам. У іх няма каранёў...» Быць без каранёў, не памятаць пераемнасці пакаленняў, не адчуваць павагі да тых людзей, якія жылі да нас, да тых месцаў, дзе нарадзіліся і ўзраслі, не шанаваць і не несці ў сэрцы матчынай мовы — значыць, быць беззаблічным, быць пазбаўленым адказнасці.

«Забываючы свае карані, — пісаў Чынгіз Айтматаў, — чалавек аказваецца па-за гістарычнай перспектывай і здольны жыць толькі сённяшнім днём». Вось і прыпадабняемся ганебна да матылёўаднадзёнак. І з гэтага бяруць вытокі нашы шматлікія праблемы: гаспадарчыя, экалагічныя, сацыяльныя.

Народнае, мудрае, спадчыннае — вось што ў першую чаргу дапаможа маладым душам не проста стаць відушчымі, але і надзеліць неацэнным дарам прадбачання, духоўнасці.

Каб высока трымаць планку навучання і выхавання, патрэбна карэнная рэарганізацыя самаго навучальнага працэсу, і, у першую чаргу, карэнныя змены ў падыходзе да выкладання роднай мовы і літаратуры. Бо вельмі ўжо крыўдна чуць папрокі, што няма належных ведаў па беларускай мове. Але прабачце, адкуль ім узяцца ў асяроддзі існуючага паўмоўя? Як сказаў адзін з маскоўскіх літаратараў: «У Мінску гавораць па-руску, але не на рускай мове». І выйсце тут адно: беларуская мова павінна быць адзінай дзяржаўнай мовай у Беларусі.

Школьны курс літаратуры таксама патрабуе грунтоўнага перагляду. Ён складзены так, што часам здольны выклікаць сум і зняважу да прадмета. Сённяшняя праграма па беларускай літаратуры вельмі скупая і аднабакова адлюстроўвае творчасць нават самых прызнаных аўтараў. За межамі нашага вывучэння застаецца лепшая, закрэсленая яшчэ да вайны, спадчына Я. Купалы, раманы К. Чорнага ваеннай пары, непамерна звужаны матэрыял па старажытнай беларускай літаратуры, сучасная паэзія, проза і драматургія вывучаюцца ліхаманкавым тэмпам у канцы адзінаццатага класа. Добра яшчэ, дапамагаюць у апошні час газеты і часопісы, прадстаўляючы нам творчыя партрэты М. Гарэцкага, П. Галавача, А. Гаруна, М. Зарэцкага, М. Маракова і іншых, пра якіх год сем назад адзін з маіх дапытлівых вучняў, прагартаўшы біяграфічны даведнік СП БССР, здзіўлена заўважыў: «І чаго гэта яны ўсе за два-тры гады паўміралі?»

Вучні, ды і ўсе мы, павінны ведаць праўду пра тыя часы, бо няма нічога больш дзейснага ў выхаванні, чым выхаванне праўдай і прыгажосцю.

**А. РУЦКАЯ.**

*Алена Руцкая*

**Колькі кроілі вас, падручнікі:**
**Абціналі, удакладнялі,**
**Падчарнялі і падбялялі,**
**Непрыручанасць часу прыручвалі.**
**Ці ж прыгладзіш людзьмі пражытае —**
**Лёсы іхнія не папяровыя;**
**Непадкупная і суровая,**
**Доля краю, ты з іх адлітая.**
**«Плямы белыя» не адолелі —**
**З праўдай сэрцы навек заручаны.**
**Вы, пакутныя лёсы, — падручнікі**
**Нашай годнасці, нашай волі.**

*Алена Руцкая*

## БЕЛАЯ РУСЬ

Я шчаслівая тым,
што ўзрасла і жыву ў
Беларусі,
І што продкаў маіх
тут калыска спрадвек і
спачын,
Што гукае тут долю
над стрэхамі клёкатам бусел,
А зязюля кукуе,
каб болей гадоў адлічыць.
На Радзіме маёй
у пашане руплівыя рукі,
І цярплівыя сэрцы,
і шчодрасць спагаднай душы.
Нас вучылі дзяды,
А ад нас пераймуць нашы
ўнукі
Запавет той адвечны —
У згодзе з суседзямі жыць.
Я багатая тым,
што вялікую спадчыну маю,
Што імёнамі слыннымі
слаўная гэта зямля.
Тут і мудрых паданняў,
і долі, і сонца хапае,
Тут і горкая памяць,
і вера святая мая.
Толькі горка, што ўсё ж
пачуваемся мала народам,
Выракаемся мовы
і песень, і строяў сваіх;
Спадкаемцы няўдзячныя
тых, хто згарэў, як паходня,
Каб не назвай пустой,
не насельнікам быць між
другіх.
Мая Белая Русь,
хай зайздросна сіпяць
пустадомкі,
Што карэнняў не маюць,
а ліпнуць, дзе цёплы куток.
Іх кароценькі век,
нам жа вечнасці свеціцца
зоркі,
Мая Белая Русь,
мой адвечны бацькоўскі
выток.



# Уражанні пасля сустрэчы

## *Імі дзеляцца студэнты філфака*

**Н. ДЗІКЕВІЧ:**

...На сустрэчы Алена Вітальеўна дзялілася вопытам школьнай работы, яна спрабавала нас ужо цяпер, на самых першых кроках да прафесіі, засцерагчы ад памылак, няправільных учынкаў, якія сустракаюцца ў настаўніцкай практыцы. Як важна, каб з першых хвілін знаходжання ў школе ты зразумеў, што дзеці — гэта ўжо асобы. У кожнага свае ідэалы, прадстаўленні, свае думкі і мары. Як важна ўбачыць у кожным з іх нешта добрае і абавязкова падтрымаць і развіваць яго.

Алена Вітальеўна спадабалася мне смеласцю ва ўводзінах новага ў школьную праграму. Трэба даваць магчымасць самім дзецям раскрываць свае таленты і здольнасці. Няхай кожны з нас выкажа свае меркаванні і прапановы, і не трэба палохацца, калі яны не супадуць з вашымі. Тады ёсць магчымасць паспрачацца і знайсці ісціну ў спрэчцы.

З гэтай сустрэчы я шмат узяла для сябе, у многім яшчэ раз пераканалася (няхай пакуль яшчэ на чужым прыкладзе!). Але пройдзе час, і ўсе гэтыя і многія іншыя парады кожнаму з нас вельмі спатрэбяцца.

Цудоўным было тое, што Алена Вітальеўна ў сваёй рабоце аб'яднала і настаўніцтва, і паэзію! Яе вершы я неаднойчы чула і раней, проста не ведала нічога аб іх аўтары. Напісаны яны ў выніку назіранняў. Тэмы вершаў вельмі злабадзённыя і вострыя. Узяць тыя, дзе высмейваюцца сляпое перайманне моды, грубасць, непавага. Асабліва мяне кранулі вершы аб Радзіме, аб родным краі, яго прыродзе і прыгажосці.

Алена Вітальеўна выхавала шмат добрых людзей. Механізатары, інжынеры, настаўнікі — у іх поспехах, у кожным добрым учынку зерне яе душы, частка працы. І ці не ў гэтым шчасце, ці не ў гэтым яе заслуга як настаўніка і як паэта?

**І. РАСАДКЕВІЧ:**

...Галоўнае, што я вынесла з сустрэчы — гэта тое, што праца настаўніка заключаецца не толькі ў веданні свайго прадмета, але і ва ўменні заваяваць сяброўства і давер дзяцей, ва ўменні дапамагчы кожнаму вучню знайсці сваё месца ў жыцці. Выкарыстанне Аленай Вітальеўнай розных форм правядзення ўрока (гульні ў рэжысёраў, сцэнарыстаў і акцёраў), безумоўна, садзейнічае гэтаму. Такія настаўнікі змогуць зрабіць нашу школу Школай Радасці, Ведаў, Імкненняў.

**Г. КУЛЬНІС:**

...Сустрэча з Аленай Руцкай была вельмі цікавай і патрэбнай для ўсіх нас. Настаўніца расказвала аб сваёй школе, яна зрабіла быццам бы ўводзіны будучым сваім калегам, расказвала, як трэба адносіцца да дзяцей, разумець іх душэўны стан, прыцягваць да актыўнай дзейнасці, лепшай вучобы. Алена Вітальеўна выказала свае адносіны да нацыянальнай культуры нашай рэспублікі і прапанавала сур'ёзна падумаць над гэтым пытаннем...

**В. ПАЛЯКОВА:**

...З усяго, што было сказана ў час сустрэчы, я зрабіла для сябе невялікія, але вельмі важныя вынікі: урокі трэба праводзіць не па стандартах. Неабходна шукаць усё новыя і новыя формы. Галоўнае, каб вучні разам з настаўнікам рабілі ўрокі больш рознабаковымі і цікавымі. Настаўнік не толькі павінен ведаць свой прадмет, але быць здольным разумець дзяцей, зрабіць іх духоўна багатымі. Трэба давяраць вучням. Тады і яны будуць шчырымі, адкрытымі. Настаўнікі павінны зрабіць так, каб вучань ішоў у школу як на свята, каб не баяўся пытацца аб незразумелых рэчах.

На жаль, у многіх педагогаў усё гэта толькі на словах. Педагогам трэба нарадзіцца.

Настаўнік з вялікай літары — Алена Вітальеўна Руцкая.

**І. РАТКЕВІЧ:**

...Дзякуючы Алене Вітальеўне, я змагла паглядзець на сваю будучую прафесію крыху з іншага боку, з боку настаўніка, а не вучня, як гэта было ў час маёй вучобы ў школе.

Я даведалася аб тых непрадбачаных сітуацыях, якія могуць скласціся паміж настаўнікам і вучнямі, як з гонарам знайсці выхад з іх, не зняважыўшы малодшага таварыша. Я падкрэсліла для сябе, што педагог павінен весці пастаянны пошук у сваёй прафесіі, укараняць новыя ідэі, цікавыя вынаходкі, каб урокі праходзілі цікава і рабяты з іх змаглі шмат чаго ўзяць для сябе патрэбнага і цікавага. Настаўнік павінен умець адстойваць свой пункт гледжання і не баяцца, што ён каму-небудзь прыйдзецца не па густу. Галоўнае, каб выкладчык сам быў упэўнены ў яе правільнасці.

Яшчэ мне вельмі спадабаліся вершы Алены Вітальеўны з школьнага жыцця. У іх столькі гумару і вясёлага задору!

**М. САЛТЫКОВА:**

Асабіста мне вельмі спадабалася тое, што Алена Вітальеўна ў кожным сваім вучні бачыць, па-першае, асобу, індывідуальнасць, і толькі потым — аб'ект для перадачы ведаў. Калі толькі выкладчык уваходзіць у клас, ён бачыць перад сабой не аднастайную вучнёўскую масу, а твары, вочы тых, хто слухае.

Алена Вітальеўна ў сваёй рабоце стараецца пазбегнуць стэрэатыпаў, праводзіць урокі нетрадыцыйна. Але менавіта на такіх уроках дзеці па-сапраўднаму зацікаўлены, лепш засвойваюць матэрыял.

**І. БУБНОВІЧ, Т. РОМУК:**

...Калі на сцэну паднялася звычайная жанчына, нават гаворка ў зале не спынілася. Але вось яна пачала расказ аб сваёй педагагічнай дзейнасці, аб тым, як цяжка стаць сапраўдным выкладчыкам, выхавацелем дзіцячай душы. І пасупова было ўсё цішэй, усе захапіліся гэтым цікавым апавяданнем.

У канцы сустрэчы Алена Вітальеўна прачытала нам некаторыя свае вершы: аб Беларусі, аб сучасным жыцці, аб захапленнях моладзі. І час праляцеў непрыкметна. Алена Руцкая развіталася з намі. Але, нават пакінуўшы залу, мы доўга яшчэ ўспаміналі розныя эпізоды з яе расказу.

